блізкароднасных народаў і культур. Толькі на фоне сусветнай літаратуры можна пераканаўча раскрыць непаўторнасць і самабытнасць нацыянальнай літаратуры, пераканаўча вызначыць той уклад, які нясе яна ў скарбніцу культуры свету ўвогуле. Адсюль вынікае, што зыходным крытэрыем сапраўднага прафесіяналізму з'яўляецца гуманітарная эрудыцыя выкладчыка, яго свабодная арыентацыя ў блізкіх ці паралельных культуралагічных працэсах іншых, асабліва суседніх народаў (напр., сялянская праблематыка, самабытнасць вобразна-паэтычных структур і інш.).

З антычных часоў сапраўдная літаратура з'яўлялася своеасаблівай "партыяй народа", выяўленнем яго гуманістычных мар і імкненняў. Калі ж яна губляла гэтыя функцыі і станавілася выказніцай вузкапартыйных ці нацыяналістычных інтарэсаў, яе выхаваўчы патэнцыял значна звужаўся. Таму грамадзянская пазіцыя лектара, яго асабістае стаўленне да актуальных грамадскіх праблем - істотная перадумова прафесіяналізму і навуковасці ў сучасным разуменні. Прынцыповасць, навуковая аб'ектыўнасць неабходны пры разглядзе праблемных пытанняў гісторыі літаратуры, яе вяршынных ці пераломных этапаў. Скажам, вытокі беларускага рэнесансу ХУ - першай паловы ХУ1 ст. ці так званы "паскораны працэс" беларускай адраджэнскай літаратуры ў пач.ХХ ст., тэорыя "вершаў беларускага складу" М.Багдановіча, узмацненне рамантычных тэндэнцый у беларускай паэзіі перыяду вайны і інш. Раскрыццё гэтых пытанняў патрабуе асабліва глыбокага аналізу сацыяльна-эстэтычных, ідэалагічных і іншых фактараў, умення пранікнуць у псіхалогію творчасці, індывідуальную манеру і г.д. Карацей, у працэсе складаных гісторыка-літаратурных з'яў неабходны ўсебаковы комплексны падыход да праблем літаратурна-творчых, эстэтычных як сродку выяўлення духоўнай культуры на розных гістарычных этапах, цесна звязаных з грамадзянскай гісторыяй народа.

Не апошняй, а магчыма важнейшай адзнакай сапраўднага прафесіяналізму лектара з'яўляецца і яго маральнае аблічча, яго адданасць справе выхавання студэнцкай моладзі як будучага рэзерву нацыянальнай інтэлігенцыі. Адданасць справе, вернасць свайму прафесійнаму абавязку, бо "немагчыма быць паразітам і патрыётам ні адначасова, ні пачаргова" (М.Е.Салтыкоў-Шчадрын). І гэта адназначна: маральнае аблічча лектара, яго адданасць сваёй справе, усведамленне свайго абавязку перад грамадствам, вера ў творчы патэнцыял новых пакаленняў сваіх суайчыннікаў надае вучэбна-выхаваўчай рабоце сапраўдную маштабнасць і эфектыўнасць.

Варапаева В.С.,
канд.пед.навук,
дацэнт

# КУРС "СУСВЕТНАЯ ДЗІЦЯЧАЯ ЛІТАРАТУРА": НОВЫ ПАДЫХОД У ВЫБАРЫ І ПАДАЧЫ МАТЭРЫЯЛУ

Курс "Сусветная дзіцячая літаратура" з'яўляецца адным з важнейшых у падрыхтоўцы спецыялістаў, якія будуць працаваць з дзецьмі. Мы разглядаем літаратуру, па-першае, не столькі як вучэбны прадмет, колькі як мастацтва, як галіну мастацкай творчасці, у тым ліку і дзіцячай. Па-другое, як адно з мастацтваў у яго непарыўнай сувязі з іншымі. І не ў сэнсе традыцыйных міжпрадметных сувязей, часам знешніх, а з пункту гледжання глыбіннай роднасці мастацтваў, адзінства іх паходжання, агульнасці ўздзеяння на чалавека, агульнасці асноўных заканамернасцей стварэння і ўспрымання мастацкіх вобразаў. А гэта дае падставу сур'ёзна ставіць і пытанне аб адзінстве прынцыпаў і метадаў выкладання розных мастацкіх дысцыплін.

Спецыфічнасць дзіцячай літаратуры і чытачоў патрабуе бездакорнага ведання і твораў, і дзіцяці. Навучыць студэнтаў арыентавацца ў патоку выдаваемай літаратуры, адбіраць якасна лепшае — задача складаная і важная, бо, як сцвярджаў В.Бялінскі, "лепш нічога не чытаць, чым чытаць дурна выбраныя творы". У першым выпадку будзе проста інфантыльны чалавек, а ў другім — з дрэнным густам, скажоным светапоглядам. Пераход жа на новыя вучэбныя планы, зліццё курсаў "Гісторыя дзіцячай літаратуры", "Руская савецкая дзіцячая літаратура", "Літаратура народаў СССР", "Замежная дзіцячая літаратура" (асобна вылучаецца толькі "Беларуская дзіцячая літаратура", бышцам яна не ўваходзіць у сусветную) пры змяншэнні колькасці гадзін значна ўскладніла праблему адбору матэрыялу выкладчыку, засваення яго студэнтамі. Дзіцячыя літаратуры, пабудаваныя на розных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канцэпцыях, патрабуюць сур'ёзных, разважлівых адносін, а не паспешлівага праходжання скопам. Возьмем, напрыклад, даволі багатую савецкую дзіцячую літаратуру. Яе ідэалагізацыя, з аднаго боку, і гуманізм - з другога, высокай якасці творы пісьменнікаў і творы "на заказ", супярэчлівасць меркаванняў - усё гэта праблемы, якія неабходна глыбока пераасэнсоўваць. Варта адказацца і ад прынятай аднамернай перыядызацыі, па-новаму паглядзець на сацыялагічныя арыенціры, у прамой залежнасці ад якіх знаходзіліся ўсе астатнія параметры гісторыі савецкай дзіцячай літаратуры. Правільныя акцэнты ў адборы, аналізе і падачы матэрыялу - важнейшая задача выкладання.

Улічваючы тое, што курс "Сусветная дзіцячая літаратура" шматслойны, у яго ўваходзяць літаратуры розных краін, варта адмовіцца ад традыцыйнай гісторыка-храналагічнай пабудовы курса. Мэтазгодна выкладаць матэрыял пэўнымі блокамі (якім будзе адпавядаць форма кантролю), разглядаючы шляхі развіцця канкрэтных жанраў (напрыклад, развіццё жанру казкі ў беларускай, рускай, скандынаўскай дзіцячай літаратуры альбо пэўных праблем, напрыклад, гуманістычны ідэал у сучаснай беларускай і амерыканскай дзіцячай літаратуры), акцэнтаваўшы ўвагу студэнтаў менавіта на тых творах, якія таго заслугоўваюць.

Апісаны падыход, безумоўна, больш складаны, ён патрабуе шырокага ахопу ведаў, аналітычнай работы, разумення літаратурнага працэсу. Можна пайсці і шляхам сумяшчэння гісторыка-храналагічнага падыходу з праблемна-тэматычным, але галоўнае, каб з поля зроку не выпала тое лепшае, што ёсць у дзіцячай літаратуры народаў свету.

Няхай М.В.,
канд.філал.навук,
дацэнт

## РОЛЯ БЕЛАРУСКАГА ГІСТАРЫЧНАГА РАМАНА Ў ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ ЛІТАРАТУРЫ

Зараз часта заходзіць гутарка аб слабай жыццяздольнасці беларускага гістарычнага рамана, аб адсутнасці ўстойлівых нацыянальных традыцый у яго развіцці. Сапраўды, у дарэвалюцыйны час, у даваенныя гады ў нас уласна гістарычнага рамана не было, хоць спробы стварыць яго назіраліся ў М.Гарэцкага, З.Бядулі, М.Зарэцкага, К.Чорнага, Я.Коласа. Але толькі пад пяром У.Караткевіча гэты жанр атрымаў статус прызнанага і паўнацэннага ("Каласы пад сярпом тваім", "Хрыстос прызямліўся ў Гародні", "Чорны замак Альшанскі"). У.Караткевіч лічыцца заснавальнікам уласна гістарычнага рамана ў беларускай літаратуры, бацькам гістарычнай прозы.

У нас дасюль няма аўтабіяграфічнага рамана, што сведчыць аб нізкай увазе да нацыянальна-гістарычнай тэматыкі. Доўгі час не знаходзіў шырокага распаўсюджвання ў беларускай літаратуры ў сувязі з афіцыйнымі забаронамі гісторыка-біяграфічны раман, ён узнік толькі нядаўна (А.Лойка, В.Коўтун, Я.Радкевіч).

З сярэдзіны 50-х гадоў інтэнсіўнае развіццё атрымаў раман на заходнебеларускую тэму (Я.Брыль, П.Пестрак, М.Машара, Г.Марчук, В.Каваленка, В.Адамчык, Г.Далідовіч). У нас склалася група так званых гісторыка-рэвалюцыйных раманаў, форму якіх пісьменнікі вымушаны былі актыўна выкарыстоўваць, бо гэта давала адзіную магчымасць хоць што-небудзь сказаць аб гісторыі роднай Беларусі ў 20-80-я гады.

Прыкметна разнастаіцца тэматыка і расце мастацкая культура ўласна гістарычнага рамана на сучасным этапе (Л.Дайнека, Э.Скобелеў, К.Тарасаў, Э.Ялугін, В.Чаропка, У.Арлоў, В.Іпатава, В.Вячорка, Т.Бондар , А.Кажадуб, П.Ламан і інш.). Паказ народнага жыцця з вялікімі экскурсамі ў гісторыю існаваў заўсёды і асабліва развіўся ў апошнія гады ва ўсіх відах рамана аб сучаснасці.

Таму ў працэсе вывучэння і даследавання творчасці раманістаў нельга абыходзіць гістарычны раман. Абысці яго ўвагай - значыла б занядбаць рэальным становішчам, не бачыць, як гэтая разнавіднасць жанру становіцца мастацкай рэальнасцю. Яна ж мае сваю і эстэтычную, і сацыяльную радаводную. У сцвярджэнні, што беларускі гістарычны раман нельга вывучаць з-за яго слабасці, тоіцца ранейшае перабольшванне іерархічнага падыходу да найболыш складаных момантаў літаратурнай эвалюцыі. Мы пераконваемся, што і цяпер існуе ў наяўнасці ідэалагічная, кан'юктурная дамінанта не толькі ў афіцыйным літаратуразнаўстве, але і ў навуковым мысленні філалагічных школ, якія яму супраціўстаяць. Менавіта гэта ў канчатковым